# Калейдаскоп

**лістапад 2021**

**Школьная газета №3(33)**

*“Наша мова для нас святая, бо яна нам ад Бога даная”*

*Ф. Багушэвіч*






# Паэты і пісьменнікі пра мову

**Калейдаскоп**
**лістапад 2021**

**Ніякае багацце людзей не бывае даражэйшым за іх родную мову. (Я. Колас)**

**Я - беларус, і я шчаслівы,**
**Што маці мову мне дала,**
**Што родных песень пералівы**
**І зблізку чую, і здаля. (Н. Гілевіч)**

**Толькі праз родную мову чалавек можа стаць беларусам, бо ў ёй хімія і фізіка, гісторыя і батаніка, эканоміка і культура таго, што называецца нацыяй, народам. (Я. Сіпакоў)**

**Народ пранясе цябе, родная мова,**
**Святлом незгасальным у сэрцы сваім. (М. Танк)**

**Дзяды і бацькі нашу мову стварылі,**
**Каб звонка звінела, была, як агонь. (П. Броўка)**

**Я закаханы ў матчыну мову, а ёю пахнуць хлеб і малако. (С. Грахоўскі)**

**Трэба любіць, ведаць і шанаваць мову свайго народа**
**і ўмець дасканала валодаць ёю. (Я. Колас)**

**Багата, родная ты мова,**
**Цябе стварыў і ўзнёс народ.**
**А вобразы якія ў словах,**
**А параўнанняў што за ўзлёт! (П. Броўка)**



# Народныя традыцыі

**Калейдаскоп**
**лістапад 2021**

***Лістапад – вераснёўскі ўнук, кастрычнікаў сын, зіме бацюхна родны.***
***У лістападзе гола ў садзе.***
***Лістапад-паўзімнік: мужык з калёсамі развітваецца, у сані перабіраецца.***
***Лістапад снегу навее – хлеба прыбудзе, а вада разальецца – сена набярэцца.***



Апошні месяц восені, адзінаццаты – года, меў старабеларускаую назву **грудзень** (ад слова "груды" ў значэнні "замёрзлая зямля"). Сучаснае беларускае найменне **лістапад** тлумачыцца проста: канец ападання лісця з дрэў (таксама ва ўкраінцаў листопад, палякаў і чэхаў listopad). Рускі ноябрь, балгарскі ноември, нямецкі, вянгерскі, славацкі nowember утрымліваюць агульную лацінскую аснову novem (дзевяць). У старажытнарымскім календары **november** – дзявяты.

У пачатку **лістапада** адлятаюць апошнія чароды качак, дрэвы стаяць ужо амаль без лісця, з`яўляюцца туманы. Вёска на нейкі час вызваляецца ад сельскагаспадарчых работ. Дары асенняга поля і лесу ўжо добра ўладкаваны ў склепах і кладоўках. Самы час успомніць тых апекуноў, якія спрыялі земляробу, і, у першую чаргу, продкаў, "дзядоў". Багаты стол запрашае сватоў парадніць сваіх дзяцей. А вечары, што сталі даўжэйшымі, нагадваюць жанчынам аб кудзелі і пілiпаўскіх вячорках. Як звычайна, назіранні селяніна накіраваны на стан прыроды, паводзіны жывёлы, птушак, па якіх ён вызначае будучае надвор’е. Неба ўсю ноч чыстае, але вакол месяца з’явіліся вялікія кругі – будзе мароз; калі ж кругі гэтыя злёгку пачырванеюць – магчыма, нават снегапад з ветрам. Калі дым з коміна падымаецца вертыкальна ўверх, няхай сабе і ў непагадзь, хутка надвор’е наладзіцца.

# Народныя традыцыі

**Калейдаскоп**
**лістапад 2021**

## НАРОДНЫЯ СВЯТЫ ЗАЛАТОГА ЛІСТАПАДА

**Лістапад – залаты лістапад… Сёння мы павядзём гутарку пра народныя святы гэтага месяца.**

"Лістапад снегу навее – хлеба прыбудзе, а вада разальецца – сена набярэцца", - так гаварылі нашы продкі пра гэты апошні месяц восені.

У пачатку лістапада адлятаюць апошнія чароды качак, дрэвы стаяць ужо амаль без лісця, тэмпература паветра ніжэй нуля, з'яўляюцца туманы. Імжыстыя дажджы ў другой палове месяца звычайна змяняюцца на мокры снег.

У гэты час самае месца ўспомніць тых апекуноў, якія спрыялі земляробу, і, у першую чаргу, продкаў, «Дзядоў».

**1 лістапада. Усе Святыя**. Памінальны дзень у беларусаў-католікаў. «Па Усіх Святых холад уйме ўсіх». У гэты дзень варылі кашу, ставілі на стол стакан вады, клалі хлеб і столькі лыжак, колькі ў хаце «дзядоў» (памерлых продкаў).

**2 лістапада. Задушны дзень.** Працяг памінальных дзён у католікаў.

Асяніны (Змітраўка, Змітравы Дзяды, Казанскія Дзяды) – памінальны дзень перад Змітрам (пятніца). Гаспадар заклікаў «дзядоў» за стол такімі словамі:

*Святыя дзяды, завём вас,*
*Хадзіце да нас!*

Пра гэтыя дні таксама казалі: «Жылі дзяды – не бачылі бяды, а ўнукі набраліся мукі».

У праваслаўных вернікаў – **Дзмітрава (Памінальная, Радзіцельская) субота** – працяг Асянім. У гэты дзень прыкмячалі: калі выпадзе снег, то будзе ён і на Вялікдзень.

**14 лістапада. Кузьма-Дзям'ян ( Кузьмінкі)** – свята шаўцоў, кавалёў. Існуюць паданні пра кавалёў Кузьму і Дзям'яна, якія змагаліся са змеем. У старой прыказцы зазначаецца: «Кузьма да Дамян – два ліцвіны, прынеслі гаршочак бацвінні» (Насовіч, 1870).

**Піліпаўскія Дзяды** – памінальны дзень перад Піліпаўкай у пятніцу і суботу (Заходняе Палессе). На Глушчыне вядома прыказка: «Піліпаўскі дзед кажа: хоць трашчу, але не пушчу».

**27 лістапада. Запусты (Загавіны на Піліпаўку)** – дзень перад Піліпаўкай.

**28 лістапада. Піліпаўка (Калядны, Піліпаўскі пост).** Шасцітыднёвы перадкалядны пост (да 6 студзеня). Гаварылі: «У Піліпаўку дзень да палудня»

Лічылася, што ў Піліпаўку збіралася «воўчае вяселле», хадзілі ваўкі зграямі. «Ек Піліпаўка настала, то ваўкі ідуць гайною» (Тураўскі слоўнік, 1984). Заўважалі: калі на Піліпаўку надвор'е хмарнае або снежнае, то травень будзе мокры.

**30 лістапада. Андрэй.** Дзяўчаты вечарам напярэдадні варажылі, сыпалі пад падушку ячмень са словамі: «Святы Андрэю, я ячмень сею, дай жа ты мне знаць, з кім я буду жаць» (Беларуская крыніца, 1928).

**З гэтага часу пачыналіся Вячоркі.**

# Папулярызацыя беларускай мовы

**Калейдаскоп**
**лістапад 2021**

## “Папацей, грамацей”

**11 лістапада** адбылося пазакласнае мерапрыемства **“Папацей, грамацей”**, накіраванае на папулярызацыю беларускай мовы, выхаванне ў школьнікаў павагі і любові да роднага слова. Удзельнікамі гульні сталі **вучні 6-ых класаў**.

Адной з асноўных мэтаў мерапрыемства стала развіццё ў школьнікаў арфаграфічнай пільнасці, творчых здольнасцей, кемлівасці. Шасцікласнікі з задавальненнем узнаўлялі прыказкі, тлумачылі значэнне фразеалагізмаў, адказвалі на “хітрыя” пытанні, падбіралі да розных прадметаў беларускамоўныя назвы.

Мерапрыемства дапамагло дзецям пашырыць свае веды па беларускай лексіцы, фразеалогіі і арфаграфіі.

**Настаўнік беларускай мовы і літаратуры В.М. Гарэева**







# Папулярызацыя беларускай мовы

Калейдаскоп
лістапад 2021

## Вандроўка па роднай Беларусі

**18 лістапада** ў беларускамоўны чацвер **вучні 6 “Б” класа** адправіліся ў вандроўку па роднай Беларусі. У час падарожжа дзеці спыніліся на станцыях: “Што ты ведаеш пра Беларусь?”, “Экалагічная”, “Чым і кім славіцца мой край”, “Гарады Беларусі”, “Дзякуй дзеду за перамогу”, “Мудрасці”. Вучні паказалі свае веды і пазналі шмат новага і цікава пра сваю краіну. Атмасфера гульні, суперажывання, пазнавальнасці зрабіла час незаўважным. Добры настрой быў забяспечаны на ўвесь дзень!

**Настаўнік беларускай мовы і літаратуры Т. М. Лістраценка**






# Папулярызацыя беларускай мовы



### Гульня-віктарына “Я люблю Беларусь”

**25 лістапада** з мэтай папулярызацыі беларускай мовы і літаратуры для вучняў **5 “Б”** класа прайшла гульня-віктарына **“Я люблю Беларусь”**. Вучні падзяліліся на 2 каманды і спаборнічалі ў адказах на пытанні. Прапанаваныя пытанні закранулі розныя тэмы: знакамітыя імёны Беларусі, гарады, прырода Беларусі, беларускі фальклор, беларуская мова і літаратура.

Удзельнікі праявілі актыўнасць і паказалі добрыя веды. Гульня-віктарына **“Я люблю Беларусь”** спрыяла пазнанню новых ведаў і сплачэнню класнага калектыву.

**Настаўнік беларускай мовы і літаратуры С.А. Юрчанка**



# Юбілейныя даты

**Калейдаскоп**
**лістапад 2021**




**Міхась Чарот (сапраўднае прозвішча — Міхаіл Сымонавіч Кудзелька)** нарадзіўся 7 лістапада 1896 года ў вёсцы Рудзенск Ігуменскага павета Мінскай губерні (цяпер Пухавіцкі раён Мінскай вобласці) у сям'і малазямельных сялян. Першую адукацыю атрымаў у наёмнага так званага «дарэктара», потым скончыў двухкласную пачатковую школу, а ў 1913 годзе паступіў у Маладзечанскую настаўніцкую семінарыю. У гады першай сусветнай вайны семінарыя эвакуіравалася ў Смаленск. Семінарыю Міхась Чарот закончыў у 1917 годзе, але настаўнічаць яму не давялося: быў мабілізаваны ў армію. Служыў афіцэрам запаснога палка ў г. Кузнецку. Вясною 1918 года Міхась Чарот вярнуўся ў Мінск, пачаў настаўнічаць у беларускай школе, паступіў на вучобу ў педагагічны інстытут. У гэты ж час ён далучыўся да культурна-нацыянальнага жыцця: спяваў у хоры В. Тэраўскага пры «Беларускай хатцы», стаў старшынёй тэатральнага гуртка «Маладзік». У1919 годзе Міхась Чарот быў у шэрагу барацьбітоў за нацыянальнае вызваленне. Даследчыкі зусім правамерна называюць Міхася Чарота адным з лідэраў беларускай савецкай літаратуры 20-х гадоў. Восенню 1923 года ўтварылася арганізацыя «Маладняк». Міхась Чарот стаў яе аўтарытэтным кіраўніком. У 1927 годзе далучыўся да «Полымя», затым, у 1928 годзе, стаў членам БелАППа. У гэты час ён — рэдактар «Савецкай Бсларусі» і кандыдат у члены ЦК КП(б)Б. У 30-я гады Міхась Чарот практычна адышоў ад літаратурнай дзейнасці. У канцы студзеня 1937 года Міхась Чарот быў арыштаваны, абвінавачаны як удзельнік «контррэвалюцыйнай нацдэмаўскай арганізацыі» і пасля допытаў і катаванняў, прызнаўшы сябе вінаватым, быў прыгавораны да расстрэлу. Загінуў 29 кастрычніка 1937 года ў Мінску. У 1956 годзе рэабілітаваны.

# Юбілейныя даты






**Міхась Зарэцкі (Міхась Касянкоў)** нарадзіўся 20 лістапада 1901 года ў сям'і вясковага дзяка ў вёсцы Высокі Гарадзец (цяпер Віцебская вобласць).

Дзяцінства прайшло на беразе Дняпра, у вёсцы Зарэчча, ад назвы якой пазней утварыўся яго псеўданім. Напачатку хлопец пайшоў па бацькавым шляху: атрымліваў адукацыю ў духоўным вучылішчы, а затым — у семінарыі. Пасля служыў пісарам у войску на Арлоўшчыне (Расія). Вярнуўшыся дадому, вартаваў храм, каб матэрыяльна дапамагчы сям'і. У 18-гадовым узросце Міхась Касянкоў стаў вясковым настаўнікам, праз год — загадчыкам валаснога аддзела народнай асветы. Найбольшая ж колькасць чалавечых характараў прайшла перад вачамі пісьменніка падчас вайсковай службы ў 1920—1927 гадах, калі ён быў камісарам.

У 1922 годзе ў газеце «Савецкая Беларусь» было апублікавана апавяданне «Спатканне». У 1925—1926 гадах выйшлі зборнікі апавяданняў «У віры жыцця», «Пела вясна», «Пад сонцам», «42 дакументы і Двое Жвіроўскіх». Дзякуючы ім пісьменнік стаў вядомым. У 1924 годзе аўтар увайшоў у літаратурнае аб'яднанне «Маладняк», пазней рэдагаваў аднайменны часопіс. У 1927 годзе Міхась Зарэцкі стаў адным з ініцыятараў утварэння літаратурнага аб'яднання «Полымя». Вучыўся малады празаік у Беларускім дзяржаўным універсітэце, адкуль вымушаны быў забраць дакументы ў сувязі з «лістом трох». Міхась Зарэцкі актыўна ўдзельнічаў у Першым Усебеларускім з'ездзе пісьменнікаў у 1934 годзе. Пасля забароны другой часткі рамана «Крывічы» ён быў выключаны з камуністычнай партыі. Працягваў пісаць, займаў пасаду загадчыка аддзела літаратуры і мастацтва ў Беларускай акадэміі навук. І ўсё ж ні талент, ні папулярнасць аўтара не засцераглі яго ад арышту ў 1936 годзе, падчас якога зніклі больш за тры тысячы старонак рукапісаў.

У наступным годзе Міхась Зарэцкі быў рэпрэсіраваны. Праз дваццаць гадоў — рэабілітаваны і апраўданы па ўсіх пунктах абвінавачанняў.

# Літаратурная старонка



*Мая Радзіма*

**Яна мне дадзена адзіная**
**На ўсё жыццё, на цэлы век.**
**Мая адзіная, радзімая**
**Ў вянках лясоў і стужак рэк.**
**Заўсёды самая прыветная,**
**Як сонца, свеціцца сама,**
**Жыве, як мара запаветная,**
**І роўных ёй — нідзе няма.**

**Яе праменнямі сагрэтая,**
**Наліта сілай маладой,**
**Іду, нястомная, па свету я**
**Яе часцінкаю жывой.**
**І ганаруся ўсюды смела я,**
**Што вырасла на той зямлі,**
**Якую клічуць Руссю Белаю,**
**Што тут дзяды мае жылі.**

*М. Шаўчонак*



# Літаратурная старонка

**Калейдаскоп**
**лістапад 2021**

## Сыпле золата з дрэў лістапад

*Неба хмарамі пакрылася,*
*Пацямнела ўсё кругом.*
*Гэта восень узмахнула*
*Дажджавым сваім крылом.*
*Непрыкметна падкрадалася*
*Да кустоў і да бяроз*
*І на лісці заставалася*
*Кроплямі бліскучых слёз.*
*Ды слязінкі тыя светлыя*
*Вецер з голля абтрасаў*
*І бярозкі танкаствольыя*
*Жоўтай хусткай пакрываў.*

*С. Панарад*



# Цікава ведаць

**Калейдаскоп**
**лістапад 2021**

## 12 лістапада – «Сінічкін дзень»

У гэты дзень жыхары розных населеных пунктаў краіны **рыхтуюцца да сустрэчы «зімовых гасцей»** - птушак, якія застаюцца на зімоўку ў нашых краях: сініц, шчыглоў, снегіроў, соек, чачотак, амялушак.Людзі нарыхтоўваюць для іх падкорм, у тым ліку і «Сінічкіны прысмакі»: несалёнае сала, семечкі гарбуза, сланечніка або арахіса, - робяць і развешваюць кармушкі. Нягледзячы на тое, што ў якасці экалагічнага свята Сінічкін дзень адзначаецца адносна нядаўна, яго гісторыя сыходзіць каранямі ў далёкае мінулае. У народным календары  12 лістапада значыцца як дзень памяці праваслаўнага святога Зіновія. Па народных прыметах, менавіта да гэтага часу сініцы, прадчуваючы хуткія халады, пераляталі з лясоў бліжэй да чалавечага жылля і чакалі дапамогі ад людзей. Нашы продкі заўважалі: калі птушкі цэлымі зграйкамі з’яўляліся каля дома, значыць, вось-вось грымнуць маразы. А яшчэ ў гэты дзень нашы назіральныя продкі прадказвалі надвор’е па асаблівых прыкметах:  « Калі сініца свішча – быць яснай дню, калі пішчыць – быць начному марозу. Збіраецца шмат сініц на кармушках – да завеі і снегападу назва». Дарэчы, назва «сініца» адбылося зусім не ад сіняга апярэння гэтых птушак, як многія могуць падумаць. Сваё імя яны атрымалі за звонкія песні, якія нагадваюць перазвон званочка: «Зінь-зінь!». А яшчэ Зіновій лічыўся святам паляўнічых і рыбакоў. Як правіла, **з 12 лістапада адкрываўся пушны сезон і сезон зімовай рыбалкі**.



# Цікава ведаць

**Калейдаскоп**
**лістапад 2021**

## Прыказкі і прымаўкі пра лістапад

**•У лістападзе кладзі капусту ў кадзі.**
**•У лістападзе зіма з восенню змагаюцца.**
**•У лістападзе світанак са змяркannем сярод дня сустракаюцца.**
**•У лістападзе цяпло марозу не ўказ.**
**•Невялікая ў лістападзе кузня, а на ўсе рэкі кайданы куе.**
**•Не скаваць раку зімы без лістапада-каваля.**
**•Лістападу снежань родны брат, верасень – унук.**
**•Лістапад – апошні месяц жывой вады.**

## Прыкметы

**Невялікі ўраджай грыбоў, значыць, зіма будзе снежнай і суровай.**

**Убачыць у канцы восені камароў, значыць, зіма будзе цёплай.**

**Вялікая колькасць жалудоў на дубе і рабіне – надвор'е зімой будзе суровае.**

**Снег у пачатку лістапада – вясна будзе ранняй.**

**Пачуць гром у канцы восені, значыць, снегу зімой будзе няшмат.**

**Калі да лістапада дрэвы не страцілі ўсю лістоту – зіма будзе доўгай і снежнай.**



Рэдкалегія:
Аліева Анастасія (9в),
Кузьміна Кацярына (9в),
Прасаловіч Юлія (9в),
Сарокіна Вікторыя (9в),
Федарэнка Вікторыя (9в).
Рэдактар Юрчанка С.А.